Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 8 Вільня, Серада 26 Лютага 1930 г. Год VI (XIV).

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:	„Бел. КРЫНІЦА" каштуе на год—6 зл., на паўгода —	Цана абвестак:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)	3 зл., на 3 месяцы — 2 зл..	на 1-шай старонцы 60 гр., 2 і 3 — 50 гр., на 4-ай —
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.	ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.	40 грш. — за радок дробнага друку ў адной шпальце

З польска-беларускай палітыкі.

Праўду кажуць самі палякі, што быццам сам лёс творыць для іх рожныя „цуды" і надзвычайныя магчымасьці.

Сьпярша вайна, меўшая быццам польскую мэту: зруйнаваць усіх трох заборцаў, падзяліўшых паміж сабой даўнюю Польшч; пасьля — францускі мір, які побач з расейскай рэвалюцыяй стварыў „Вялікую Польшчу", каб замяніць для Францыі адсутную Расею... Аддадзеныя былі Польшчы — з гвалтам над слаўнымі пунктамі Вільсона вялізарныя ня польскія тэрыторыі, насяленьне якіх ня мела ніколі ніякіх падставаў — ані нацыянальных, ані сацыяльных, ані ў большасьці і царкоўна-рэлігійных — мець давер і любоў да польскай улады. Аднак-жа і тутака „польскі лёс" зрабіў для Польшчы „цуд"; баючыся крывавага бальшавіцкага тэрору, насяленьне гэтых „крэсаў", асабліва беларускіх, запраўды-ж вітала сьпярша прыход у Край польскіх легіонаў, як сваё збаўленьне.

Разгон Усебеларускага З'езду маскоўскімі бальшавікамі, арышты беларускіх дзеячоў, забойства і грабяжы сярод беларускага сялянства — усё гэта было яркім фонам, на якім ярка адбівалася слаўная адозва Язэпа Пілсудскага — аб тэй адбудове Вялікага Княства Літоўска-Беларускага, якую прызваны будуць тварыць разам з палякамі: украінцы, беларусы і літоўцы, „як вольныя з вольнымі і роўныя з роўнымі"...

Як-жа-ж польская ўлада выкарыстала тады адносна нас нячуваную магчымасьць?

Ня будзем раздражняць старых ранаў. Прыпомнім толькі, дзе цяпер такія чаловыя і гарачыя павадыры полёнафільскага лагеру, — якім былі ў свой час Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Смоліч і шмат, шмат інш.

Пад уплывам гэтых магчымасьцяў пайшла „адбудова моцарствовай Польшчы", пры якой ужо — ані аб роўных і вольных беларусах дый іншых ня-польскіх народах Польшчы, ані аб украшэньні Вялікага Княства Літоўскага ня было ўжо ніякай гутаркі... Што рабілася за гэты час, усе мы добра памятаем. Запанаваў польскі нацыяналізм. Прем. Скульскі заявіў, што „беларускага духу ў Польшчы хопіць толькі на 50 гадоў"... Сікорскі двойчы ашукаў авансаваны яму давер беларускіх паслоў... Беларускае школьніцтва, створана нямецкімі акупантамі, было зьнішчажана адным махам.

Умацаваўшыся дзяржаўна, Польшча з беларусамі перастала лічыцца цалкам... А тымчасам на Ўсходзе рабіліся рэчы запраўды несподзяваныя.

На Усходзе зрабіўся вялізарны пералом: расейскія бальшавікі — пад націскам шчырых украінскіх і беларускіх барацьбітоў і культурнікаў — дзіўна паразумнелі: бальшавікі пачалі, поруч з апошнімі, супольнымі сіламі рабіць беларускую галаву ў Менску, у цэнтры Усходняй Беларусі, прывязваючы гэтым і беларускае сэрца да ўсходу... Яны стварылі ў Менску і іншых местах Беларусі вялізарную сетку народных беларускіх школаў, некалькі дзесяткаў гімназіяў і пяць вышэйшых школаў — з Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэтам і Беларускай Дзяржаўнай Акадэміяй на чале...

У той самы час, калі на беларускім усходзе йшла гэтая культурна-асьветная і гаспадарчая праца — над усебаковым нацыянальным уздымам народу, у заходняй частцы Беларусі дасьпявала шпаркім ходам павольная рэвалюцыянізацыя беларускага сялянства, і ці-ж не забіўчым для польскай палітыкі цьверджаньне яго дзяржаўнага абвінцэля на працэсе Грамады, што апошняя стварыла 90.000 армію, якая мела мэтай... адарваньне беларускіх земляў ад Польшчы і далучэньне іх да Беларускай Радавай Рэспублікі?!

Цяпер на нашых вачох „польскі лёс"— хіба-ж ужо апошні раз! узноў стварае новую, можа яшчэ лепшую магчымасьць для Польшчы... Маскоўская галава, якая ў свой час выказала столькі геніяльнага розуму ў справе прывязваньня да сябе сваіх нязлічаных „інародцаў", на нашых вачох траціць цалкам гэты здаровы розум... Цэнтральная ўлада ў СССР яўна вар'яцее. Запраўды-ж толькі ў стане вар'яцтва можна распачаць пляновую акцыю бурэньня ўсяго таго, што было створана за апошнія 7—8 гадоў для ўкраінцаў і беларусоў. У выніку хваляў узнавіўшагася крывавага тэрору, нацыянальных і рэлігійных рэпрэсіяў, якіх даўно ўжо сьвет ня чуў у толькі што быццам вольнай Беларускай Рэспубліцы, катастрафіча падаюць усе сымпатыі беларускага грамадзянства да ўсходу і ў Заходняй Беларусі... Калі дагэтуль тутэйшае беларускае грамадзянства за усё тое, што рабілася і зроблена ў Менску для Беларускай справы, шмат што выбачала маскоўскім бальшавіком — з болем сэрца, дык цяпер, калі выбачаць няма за што, справа робіцца зусім яснай...

Цяжка, ой, цяжка беларусам пад Польшчай... Бо-ж не падзеяла на польскі розум нават справа Грамады!.. Але-ж на шчасьце Польшчы — ў Радавай Беларусі здаецца распачынаецца такое пекла, перад якім бляднее ўсё, што пераносіла дагэтуль шмат пакутная Беларусь наагул...

Ці-ж можна аднак-жа — памятаючы ўсю 12-ці гадовую гісторыю беларускага жыцьця пад Польшчай, верыць у тое, што Польшча захоча шчырым сэрцам і здолее добра розумам выкарыстаць гэтую нячуваную і баечную, як быццам наўмысна абсталяваную для Польшчы новую, „беларускую кан'юктуру"?!

Трудна паверыць!

12-ыя угодкі незалежнасьці Літвы.

16-га лютага споўнілася 12 гадоў, як Літва жыве жыцьцём незалежным, самастойным. Дзень гэты для Літвы сапраўды вялікі. Дык нічога дзіўнага, што літоўскі народ сьвяткаваў яго дужа ўрачыста, як там, у Літве незалежнай, так і тут, пад Польшчай.

У Коўне а 10 гадзіне раніцы па ўсіх касьцёлах было адпраўлена ўрачыстае набажэнства за памыснасьць Літвы. Папаўдні ў Вайсковым Музэі адбылася ўрачыстая акадэмія, на якой ген. Нагевіч прачытаў да народу пісьмо Прэзыдэнта. Акадэмія скончылася песьняй „Мы не памром бяз Вільні."

А 8 гадзіне вечарам у дзяржаўным тэатры адбылося адпаведнае прадспаўленьне, а так-жа была прачытана лекцыя аб незалежнасьці Літвы. Усе гэтыя ўрачыстасьці былі перадаваны ўсяму сьвету па радыё.

Але ня менш урачыста сьвяткавалі літоўцы сваю незалежнасьць і тут у Вільні.

Прад днём незалежнасьці, у дзень сьмерці патрыярха літоўскага народу Я. Басановіча адбылося жалобнае набажэнства.

Назаўтра 16-га лютага а гадзіне 11 дня адбылося так-жа ўрачыстае набажэнства за незалежнасьць Літвы. Па гэтым набажэнстве літоўскія скаўты на магілу Я. Басановіча ўзлажылі вянок.

А гадзіне 8 вечарам у купецкай салі адбылася дужа ўрачыстая акадэмія. Народу было поўна. Ад Бел. Нац. К-ту вітаў літоўцаў пасол сойму А. Стэповіч, заклікаючы да супольнага змаганьня за лепшае заўтра літоўцаў і беларусаў.

Праўда, у буджэт унесены, дзякуючы захадам у Сойме нашых беларускіх паслоў, галоўным чынам п. Ярэміча пры падтрыманьні лявіцы і „В.Б.", паўмільёна злотых на культурна-асьветныя патрэбы Беларусаў; гэта першы раз за ўвесь час існаваньня Польшчы!

Але запраўднай зьмены ў польскай душы, як бы сказаць — „маральнага яе разбраеньня адносна да Беларусаў, шчырага павароту тварам да Беларускага народу, мы яшчэ з боку польскага грамадзянства ня бачым... Дык можа і гэтага паўмільёна злотых будуць выкарыстаны — страшна сказаць! — дзеля далейшага разьбіваньня беларускага грамадзянства, дзеля падтрыманьня прышоўшай на зьмену Аляксюкоў, Паўлюкевічаў, Умястоўскіх так зв. польска - беларускай санацыі, на чале з А. Луцкевічам і Р. Астроўскім, а для народу можа астанецца ад гэтага ўсяго вельмі мала, калі ня чыста мінус...

Словам, усе польскія палітычныя адносіна беларусаў магчымасьці, ідуць звычайна на беларускую некарысьць. Аб гэтым у ва ўсёй сваей адраджэнскай працы і ў адносінах да акцыі цяперашніх полёнафілаў — Луцкевічаў і Астроўскіх беларускае грамадзянства павінна помніць заўсёды.

М.

Ад беларускай моладзі прамаўляў студэнт М. Пецюкевіч, рэдактар часопісі „Шлях Моладзі“, падчорківаючы моцна веру ў тое, што моладзь абодвых народаў ускрасіць традыцыі слаўнага сужыцьця літоўцаў і беларусаў і згодна з гэтымі традыцыямі далей павядзе працу за поўнае вызваленьне абодвых народаў.

Ад беларускага студэнства прамаўляў студэнт С. Станкевіч, а ад украінскага студэнт Сагайко.

Нязвычайна прыгожыя сьпевы літоўскіх маладых салістаў, а так-жа хоу завяршылі ўрачыстасьць сьвята незалежнасьці Літвы як ня трэба лепш.

Характэрна, што на гэтай урачыстасьці незалежнасьці Літвы ня было прывітаньняў ані ад палякоў, ані ад беларуска-польскай санацыі. Яны заняты будаваньнем польска-беларускага фронту.

Затое з прыемнасьцяў трэба адзначыць тое згоднае супрацоўніцтва трох братніх народаў: літоўцаў, беларусаў і ўкраінцаў у асобе незалежніцкіх груп, якое трывае ўжо гады два і якое ўсьцяж паглыбляецца і мацуецца.

У гэтым сьветлая будучыня гэтых трох народаў. Z.

З Беларускага жыцьця.

З БЕЛАРУСІ ПАД ПОЛЬШЧАЙ.

Незацьверджаньне Статуту Т-ва беларускай моладзі „Будучыня“. Віленскі ваявода Статуту Т-ва бел. моладзі „Будучыня“ не зацьвердзіў. Беларуская моладзь згрупаваная каля „Шляху Моладзі“, не згаджаючыся з адмовай ваяводы робіць заходы дзеля паноўнага разгляду Статуту „Будучыня“ дамагаючыся зацьверджаньня.

Супольная гарбатка беларускай, літоўскай і украінскай студэнскай моладзі. У нядзелю 23 г. м. адбылася супольная гарбатка прадстаўнікоў студэнскіх саюзаў: літоўскага, беларускага і украінскага. На гарбатку быў запрошаны госьць з Англіі, студэнт англіец, які езьдзячы па Эўропе, студыюе палажэньне народных меншасьцяў.

Арышты. Як даведваемся, у часе апошніх арыштаў у Ашмянскім павеце, былі арыштаваныя і сябры Бел. Інст. Гаспадаркі і Культуры: Пётр і Сымон Сасноўскія, Аляксандра Шчасная, Базыль і Ўладзімір Караваі і Янчуковіч Віктар, а так-жа зроблены вобыскі у гуртках Бел. Інст. Гаспад. і Культ: у Шугавічах і Сьвірыдавічах. Але пасьля карогкага сьледзтва ўсе зволньнены.

Зацьверджаньне канфіскаты № 6 „Бел. Крыніцы“. Акружны Суд канфіскату № 6 „Бел. Крыніцы“ зацьвердзіў.

Агульны сход Бел. Нацыянальнага К-ту. У нядзелю 2 сакавіка мае адбыцца агульны сход абноўленага Бел. Нацыянальнага Камітэту.

З РАДАВАЙ БЕЛАРУСІ.

Камуністы не перастаюць прасьледаваць беларусаў. Аб паходзе комуністаў процім Беларускай Акадэміі Навук у Менску мы ў свой час пісалі. Цяпер даведываемся з бальшавіцкіх газэтах, што камуністычныя ўлады Радавай Беларусі арыштавалі беларускага паэта Якуба Коласа.

Пры гэтым трэба яшчэ раз успомніць, што пасьля выдаленьня з Бел. Акадэміі Навук Вацлава Ластоўскага і яго арыштаньня, тый-ж комуністы згадзіліся на кандыдатуру Якуба Коласа на становішча віцэ-старшыні Акадэміі, а цяпер арыштавалі і яго. Чуткі ходзяць, што бальшавікі дабіраюцца і да Янкі Купалы, каб зрабіць і з ім тое самае, што з Якубам Коласам.

Прамова пасла Ф. Ярэміча

на паседжаньні ў Сойме ў часе дыскусіі над буджэтам 1930-31 году у справе школьніцтва.

Высокі Сойм! Справа беларускага школьніцтва ў працягу 10-ці гадоў існаваньня Польскае дзяржавы ня толькі не пасунулася наперад, але на'т і скорчылася. Маю вельмі мала часу на тое, каб прадставіць хронолёгічна гісторыю беларускай школы, дык хачу толькі адзначыць, што ў часе нямецкай акупацыі мы мелі 201 школу, за часаў г.зв. Сяр. Літвы — 400 школ, у 1925 годзе згодна з школьнымі ўставамі было падана дэкляратцыяў на 412 школ, а цяпер маем усяго 20 і некалькі школ. Вось гэта кароткая гісторыя беларускай школы.

Да гэтага часу, калі мы зьвярталіся да міністра ў справе школьніцтва, дык нам заўсёды разводзячы рукамі міністар гаварыў: „Пан Пасол знаходзіцца ў Сойме, дык калі ласка вызначце крэдыт, а тады ўжо можна будзе нешта пачаць“. Вось-жа, паны, беларускі народ, як мне здаецца, павінен мець ня толькі абавязкі, павінен ня толькі плаціць падаткі і даваць рэкрутаў, але павінен мець якія-колечы правы, а дзеля таго пара, каб з правоў хоць малых што-не-будзь скарыстаў. Я ня буду займаць шмат часу, хачу толькі сказаць, што з алавікам у руках вельмі старанна абліччыў і ўставіў да некаторых артыкулаў папраўкі, каб Сойм прыняў іх, каб хоць раз ужо выйсьці з блуднага кола і каб можна было распачаць будову беларускай школы.

Да гэтага часу — ці-ж гэта не недарэчнасьць? — маем пры 2-х з палавінаю мільёнах жыхарства, дзьвацаць і некалькі школ і ані аднэй вучыцельскай сэмінарыі.

Дык вось-жа просім, каб Сойм высыгнаваў 100 тысяч злотых на ўтварэньне беларускай вучыцельскай сэмінарыі. А так-жа просім — 50 тысяч зл. на выданьне школьных падручнікаў і 150 тыс. зл. на беларускія курсы, на якіх нашы вучыцялі маглі-б дапоўніць свае кваліфікацыі.

І нарэшце ставім 200 тысяч злотых на заканчэньне гмаху для беларускай гімназіі ў Навагрудку, будова якога ўжо распачата стараньнем беларускага грамадзянства і даведзена да першага паверху.

Канчаючы, падаю папраўкі і прашу Высокую Палату, прыняць іх.

Ад рэдакцыі: Пас. Ярэміч прамаўляў і ў справе буджэту М-ва Справядлівасьці, заклікаючы не будаваць турмаў, а пастанаўляць амнэстыі для палітычных вязьняў. У зьвязку з справай б. беларускага пасла Ю. Сабалеўскага, пас. Ярэміч заклікаў Мін. Справядлівасьці зьвярнуць увагу на парадкі і склад Віленскай Апэляцыі. Прамовы гэтай не зьмяшчаем з браку ў газэце месца.

Наш адказ Р. Астроўскаму, дыр. Віленскай Беларускай гімназіі, на яго пісьмо, зьмешчанае ў газ. „Наперад“ у нумары 7 12 лютага 1930 г.

Ад самага пачатку выхаду ў сьвет органу польска-беларускай санацыі „Наперад“, як з вядра паліліся на нас рознага роду памыі і ліюцца яны бадай без перастанку далей. Гэта выпрабаваная мэтода бяспринцыпнага палітычнага жонглёра Антона Луцкевіча. На ўсе гэныя напады, мы спайняючы свой грамадзкі абавязак заўсёды адказваем, выказваючы адначасна, дзе жарало праўды.

У нумары 3, с. г. „Наперадзу“ Луцкевіч цынічна робіць нам закід, што мы разам з комуністамі працуем на школу віленскай беларускай гімнагіі, стараючыся ўзарваць яе.

Безпадстаўны, выдуманы, ілжывы гэты закід Луцкевіч зрабіў нам, каторыя гімназію ўсьцяж баранілі, супакойвалі вучняў і навет для дабра гімназіі многае замоўчвалі за часаў дырэктарства Астроўскага, яшчэ як грамадаўца.

Ясна, на гэны ілжывы на нас паклёп „Наперадзу“ мы мусім адказаць і адказалі. Мы збольшага выказалі, што гэныя высока нэтычныя Луцкевічаўскія цалком галаслоўныя закіды ўзрываньня намі гімназіі, пушчаны ў ход дзеля самаабяленьня.

Слушна кажуць — удэр у стол, дык нажніцы адазвуцца. Так і тут. У адказ на нашу абарону ў нумары 7 „Наперадзу“ с. г. паявілася пісьмо Р. Астроўскага, дырэктара беларускай віленскай гімназіі за часаў існаваньня „Грамады“ і цяперашняга, якога мы так-жа для дабра гімназіі ўсьцяж аберагалі і на ўсе яго палітыканствы, як дырэктара, прызнаёмся, часта глядзелі праз пальцы, думаючы, што ўсёж у гэтым чалавеку дабро духовае паверанай яму нашай моладзі возьме ўрэшце верх над яго ніколі неабліччальнымі і звычайна безадказнымі амбіцыямі палітычнымі.

Але пісьмо Астроўскага дало нам права і абавязак загаварыць і аб ім.

У сваім пісьме Р. Астроўскі пацьвярдзіўшы ўсю тую Луцкевічаўскую ілжу аднасна нас, яўна разыходзячыся з праўдай, прабуе даказаць, што за часоў яго дырэктарства раней, у віленскай беларускай гімнагіі быццам не вялася ніякая палітыка і што ўсе прошлагодня авантуры ў гімназіі моладзі і выдаленьні з яе нешта да сотні вучняў — гэта вынік агітацыі быццам нейкіх пастаронных асоб.

Вось-жа ў імя праўды заяўляем, што гэтакае цьверджаньне — гэта ёсьць яўная разыходжаньне з праўдай. За часоў „Грамады“, калі Астроўскі быў дырэктарам віленскай беларускай гімназіі, грамадаўская палітыка ў гімназіі была поўнай паняй і гэта з ведама і зволі таго-ж Астроўскага, як дырэктара гімназіі. Аб гэтым дасканальна ведаюць бацькі выкінутых з гімназіі вучняў, ведаюць самі дзеці, ведае грамадзянства. Гэта факт, якога запярэчыць немагчыма.

Першая-ж і галоўная прычына забурэньняў вучняў і іх выдаленьня была ня звонку гімназіі, але іменна ў гімназіі, прадусім у асобе яе дырэктара Астроўскага і цяперашняга вучыцеля Луцкевіча. Астроўскі ад „Грамады“, якая ўжо кіравалася на Маскву, павярнуў на Польшч, творачы з Луцкевічам кірунак так званы беларуска-польскай санацыі, які яны вядуць і сяньня. Гэты факт у вачох моладзі, узгадаванай тым-жа Астроўскім, як тагачасным дырэктарам гімназіі па грамадаўску і Луцкевічам, як пісакам у грамадаўскіх газэтах і грамадаўскім ідэолёгам, асабліва ў кірунку сяньня бязбожжа і выхваляньня бальшавіцкай „незалежнай Беларусі“, як ён усьцяж паўтараў і ў газэтах і даволі часта ладжаных для моладзі лекцыях, гэты факт быў яўнай здрадай, як казала тая-ж моладзь „працоўнага народу“. „Грамада за кратай, а здраднікі пршлі да нас, каб і нас скіраваць на такую дарогу, ім гэта ня ўдасца“ — гаварыла нам група вучняў, прыходзячых часта да нас з сваім жалем у рэдакцыю. Вось-жа моладзь і выступіла процім гэных „здраднікаў“, сваіх вучыцеляў і жорстка пацярпела. Дык ясна, што галоўнымі вінаўнікамі тут зьяўляюцца Астроўскі і Луцкевіч, якія накруціўшы моладзь у адзін бок, адважыліся прысьці да яе і пачаць круціць у другі бок згодна з сваімі палітычнымі махінацыямі.

Ясна, што гімназія за дырэктарства Астроўскага раней была фармальным аружжам грамадаўскай палітыкі. Гэтакіх сваіх адносін да тэй-жа гімназіі той-жа дырэктар не зьмяніў і цяпер. Бел. віл. гімназія сяньня ня ёсьць, праўда, аружжам грамады гэтай даўнейшай, бо сяньня „Грамады“ няма, але ёсьць аружжам палітычнага кірунку, які групуецца каля газэты „Наперад“, які называе сябе радыкальным і на чале якога стаяць Луцкевіч і Астроўскі. Да гэтага прызнаецца ў сваім пісьме і сам Астроўскі, кажучы, што сучасны кірунак гімназіі „радыкальна - народніцкі“. Гэтак-жа Астроўскі і Луцкевіч і называюць той полёнофільскі палітычны кірунак, які яны сяньня ствараюць, а які ёсьць кірунак польска-беларускай санацыі.

Вольна паном Астроўскім і Луцкевічам зьмяняць свае палітычныя ар'ентацыі, як рукавічкі, вольна рабіць пераскокі ад краснага знамені да белага арла, але нявольна з гімназіі рабіць аружжа кірунку ані „радыкальна-народніцкага“, так сяньня — няведама як на доўга—мілага сэрцу іх, ані буржуазнага, ані соцыялістычнага, ані клерыкальнага, ані якога іншага, апрача толькі кірунку, калі так можна назваць, пэдагагічнага, маючага на воку адно толькі чыстую навуку і ўзгадаваньне так запушчанай у гэтым сэнсе нашай моладзі. Ня можна забывацца, што гімназія гэта ня прыватная крамка паноў Астроўскага і Луцкевіча, дзе яны могуць таргаваць акцыямі сваей палітыкі, але выключна культурна - прасьветная ўстанова, як уласнасьць усяго беларускага грамадзянства.

У Лідзкім вокрузе выбары ў Сойм скасаваныя.

Аб тым, як адбываліся ў 1928 г. у Лідзкім вокрузе выбары, нашы чытачы ведаюць. Беларускі спісак № 18 там быў скасаваны. Беларусы на нязгоднае з законам скасаваньне сьпіску № 18 падалі скаргу ў Найвышэйшы Суд, які разгледзіўшы гэту справу 24 г. м. выбары ў Лідзкім вокрузе скасаваў.

З прычыны гэтай страцілі пасольскія мандаты: ведамы полёнофіл Янка Станкевіч, Ф. Валынец, з Б. Б. К Акуліч, Б. Камінскі, Я. Шчэрба, Я. Лойка і эндэк Г. Гарчевіч. Новыя выбары яшчэ пакуль-што ня вызначаныя.

Да Лідзкага вокругу належаць паветы: Лідзкі, Шчучынскі, Ашмянскі, Валожынскі, Маладэчанскі і Вялейскі.

З Польшчы.

Касаваньне выбараў. Як адбыліся апошнія выбары ў польскі парлямант — Сойм і Сэнат нашы чытачы добра ведаюць. Спіскі пакасаваны бяз ліку амаль у кожным выбарным окрузе. Некаторыя падавалі скаргі ў Найвышэйшы Суд, а многія паапускалі рукі і нікуды ня скаржыліся. Вось-жа цяпер пасьля адстаўкі міністра справядлівасьці Цара—галоўнага выбарнага камісара, за часоў якога было так шмат пакасавана выбарных сьпіскаў — Найвышэйшы Суд пачаў касаваць у некаторых вокругах выбары. Скасаваны ўжо ў окрузе Сандомерскім і Луцка-Валынскім. На чарзе стаяць округі: Сьвянцянскі, Віленскі, Наваградзкі і іншыя.

Сойм і Сэнат. У Сойме цяпер разглядаюцца соймавай конституцыйнай камісіяй праекты конституцыі, а Сэнат прыступіў да разгляду прынятага соймам буджэту. Цікава, ці ў сэнаце знойдзецца адпаведны лік галасоў, каб правесьці 500 тысяч зл., якія адважыўся польскі Сойм вызначыць на беларускія школы і падручнікі.

Аб царкоўным Саборы ў польскім сойме. У часе разгляду буджэту мін. веравызнаньня. праваслаўныя паслы закранулі і справу Царкоўнага Сабору. Украінскі пасол Хруцкі, крытыкуючы адносіны мін. да царкоўнага Сабору, а так-жа няведамага „Беларускага Царкоўнага К-ту“, які сваей адозвай у „Наперадзе“ натрапляючы ў такт польскіх палітыкаў, заклікаў байкатаваць на Сабор выбары,—заявіў, што „няможна сьвецкай уладзе ўмешывацца ў чыста ўнутраныя справы царквы, ня можна змагацца за лепшы склад і арганізацыю Сабору пры помачы ўраду, бо падобная тактыка ёсьць супярэчна з самой ідэяй саборнасьці. Як бачым, дык і ў Сойме пазналіся праваслаўныя паслы на працы няведамага „Бел. Царк. К-ту“, якога беражэцца тайна псэўдоніму ў Луцкевічаўскім „Наперадзе.“

З заграніцы.

Пратэсты проціў прасьледаваньня рэлігіі ў С.С.Р.Р. Мы ўжо ня раз пісалі аб прасьледаваньні ў С. С. Р. Р. комуністамі рэлігіі. У апошнія часы гэты прасьлед з прычыны праводжаньня там колектывізацыі—камуны, яшчэ больш узмогся. Цярплівы хрысьціянскі сьвет далей бальшавіцкіх зьдзекаў над рэлігіяй і веруючымі людзьмі сьцярпець ня мог і выступіў з пратэстам. Першым выступіў галава каталіцкага Касьцёла папа Піус XI, аб чым мы пісалі ў прошлым нумары, за ім выступілі так-жа і протэстанскія біскупы: у Англіі, Нямеччыне, Францыі і іншых дзяржавах. Пасьля выступленьняў папы і протэстанскіх біскупаў у ва ўсіх хрысьціянскіх дзяржавах Эўропы, а так-жа і ў Амэрыцы пачаліся многалюдныя пратэсты хрысьціян і нехрысьціян супроць дзікіх комуністычных гвалтаў над рэлігіяй у С.С.Р.Р

Бальшавікі, хочачы абмануць даверчывы цывілізаваны сьвет, выдалі быццам ад праваслаўных біскупаў у С. С. Р. Р. запярэчаньне, — што быццам у С.С.Р.Р. няма ніякага прасьледаваньня рэлігіі і ёсьць поўная свабода сумленьня. Рэч зразумелая, што гэтай афэрай бальшавіком закрыць прад сьветам свае злачынствы не ўдалося — ніхто не паверыў, а толькі яшчэ ясьней стала, што бальшавікі да прасьледаваньня рэлігіі змушаюць і праваслаўных біскупаў.

З прычыны нячуваных зьдзекаў над рэлігіяй у С. С. Р. Р. у дзяржавах заходняй Эўропы людзі на протэстацыйных сабраньнях дамагаюцца ад сваіх урадаў сарваньня з С. С Р. Р. дыпляматычных зносінаў.

У Францыі ў Парыжы 26 I с. г. прапаў ня ведама дзе дзеўшыся расейскі генэрал Кутепаў. Дзеля таго, што Кутепаў быў адзін з павадыроў проціў бальшавіцкіх арганізацыяў заграніцай, падазраюць, што яго схапілі бальшавіцкія заграгічныя агенты, падтрымліваныя пасольствамі С. С. Р. Р заграніцай. Гэтым здарэньнем зацікавіўся амаль увесь сьвет. Хаця сьледзтвам яшчэ і не аткрыта дакладна, што Кутепова схапілі і кудысьці вывязьлі або забілі заграгічныя бальшавіцкія агенты, аднак публічная апінія і ў некаторай меры сьледзтва шуканьня Кутепава пацьвярджаюць, што гэта работа бальшавікоў.

З прычыны гэтай і прасьледаваньня комуністамі ў С.С.Р.Р. рэлігіі, францускае грамадзянства дамагаецца ад ураду сарваньня з С. С. Р. Р. дыплёматычных зносінаў.

Мэксыка з С.С.Р.Р. усе зносіны сарвала. Пасьля сарваньня дыплёматычных зносінаў, мэксыканскі ўрад прыарыштаваўшы бальшавіцкага консуля, загадаў уладам зрабіць у консульстве рэвізію. У часе рэвізіі знойдзены кампрамітуючыя дакуманты.

У Нямеччыне, як ведама, поўная грамадзкая свабода. Там нелегальных партыяў няма — ўсе легальныя. Комуністычная партыя так як і ўсе іншыя так-жа легальная. Вось-жа комуністы, карыстаючыся з эўропэйскай толеранцыі, у апошнія часы пачалі шумець сваімі дэмонстрацыямі, якімі хацелі паказаць заходняй Эўропе сваю сілу. Супроць камуністаў пачалі так-жа выступаць іншыя партыі, у выніку чаго паўставалі суматохі. У гэтыя суматохі дзеля ўтрыманьня парадку ўмяшалася паліцыя і пусьціла ў ход гумовыя палкі, а ў некаторых выпадках ужывала і стрэльбаў. Камуністы, хочачы паказаць сваю сілу, заклікалі работнікаў да агульнай дэмонстрацыі, аднак гэта ім не ўдалося і замест сілы паказалі сваю слабасьць. Пасьля ўсяго гэтага камуністычная партыя ў Нямеччыне ўсё-ж такі астаецца легальнай.

Аб гаспадарцы.

Зімовая небясьпека для азімых пасеваў.

Кожнаму гаспадару-земляробу вядомым ёсьць зьявішча, што ледзь толькі сойдзе сьнег з поля, як на азімых пасевах даюцца заўважыць плямы руні або пажаўцеўшай або спавітай у нейкую белую павучыну. І першае і другое ёсьць доказам, што рунь гэта хворая, Каб яе карысна лячыць, трэба ведаць прычыну хваробы. Разгледзьмо па парадку.

Прычынай пажаўценьня руні найчасьцей бывае мароз, які або проста замарожывае пасевы няпрыкрытыя сьнегам, або што бывае шмат часьцей — разрывае карэньні руні. Гэта апошняе асабліва небясьпечна і здараецца пры паўтараючымся зьмярзаньні і разьмярзаньні верхняга пласта глебы. Пры адлізе верхні пласт глебы ападае, пры марозе-ж той самы пласт павялічвае сваё абыймо (таксама, як замярзаючая вада ў бутэльцы) і стараецца перадусім расплысьціся ўшыркі. Сустрачаючы аднак у гэтым кірунку перашкоды выгібаецца толькі ўверх і адлушчаецца ад споду, як скарынка ў перапечаным хлебе. Пры паўтараючымся зьмярзаньні і разьмярзаньні глебы карэньні руні або разрываюцца, калі яны былі досьць доўгія, або толькі трацяць лучнасьць з сподам глебы, або ўрэшце — і гэта ўзноў найчасьцей — раз-за-разам цэлыя расьцінкі ўсё больш і больш выцягіваюцца з каранём наверх і з часам апынуцца з глебы сусём выцегненымі: маладая расьціна, ня могучы чэрпаць зямной вогкасьці, вяне, а па часе і засыхае.

Як ад бяды радзіць? Сказана было, што расьціна гібее ад разарваньня каранёў і ад нястачы вогкасьці. Разарванага караня, пэўна-ж, цэлым ужо ня зробіш, але даплыў патрэбнай для ўзросту расьціны вогкасьці вярнуць часта яшчэ можна: трэба прыпадняты марозам верхні пласт глебы прыціснуць да споду. Робіцца гэта пры помачы сярэднецяжкога гладкага валу, з якім трэба на вясну выехаць у поле, як толькі яно асохне. Гэткім заходам робяцца дзьве работы: верхні прыпадняты пласт прыціскаецца да споду, скуль будзе магчы ссаць вогкасьць, а выцягненыя расьціны ўціскае ў зямлю ўзноў і яны, хоць ня ўсе, але ўсё-ж прыжываюць.

Горш бывае з руньню спавітай на вясну быццам у белую павучыну. Лячыць яе ўжо цяжка, бо сьнежную плесень — гэтак завецца гэта хвароба — можна губіць толькі ў зародку, у сяўбовым насеньні пры помачы байцаваньня (заморываньня хваробных зародкаў).

Агулам бяручы, слабую рунь на вясну можна й трэба ўспамагчы абсеіваньнем яе азотнымі штучнымі ўгнаеньнямі (парашкамі), як азатняк, чылійская салетра і іншыя.

(З працаў інж. Ад. Клімовіча).

Каталёг.

(Кнігаспіс)

беларускіх кніг уласных кнігарні «Пагоня» (Вільня, Людвісарская 1), а так-жа ўзятых на продаж ад другіх выдавецтваў.

Я – J

Ядвігін Ш. — Васількі. Выд. Бел. Выд. Т-ва. Зборнік расказаў. Вільня, 1919 г. Стр. 120. Цэна 2,00

Jadwihin Š. — Uspaminy. Wyd. „Łučynki“ U „Uspaminach“ aŭtar apiswaje swajo prabywańnie ŭ Butyrskaj maskoŭskaj turmie za rewolucyjnuju rabotu, budučy studentam u kancy XIX stalećcia. Miensk, 1914 h. Str. 63. Cana 0,60

J. Jöergensen. — Prypowieści. Pierakłaŭ na biełaruskuju mowu X.P.T. Wyd. „B. Krynicy,“ Wilnia, 1927 h. Pryhožyja filozofična-relihijnyja narysy. Str. 55. C. 0,50

Езавітаў К. — Становішча Беларускае школы ў Латвіі. Адбітак з газэты „Новае Жыцьцё. Вільня, 1923 г. Стр. 28. Цана 0,30

Ігараў. Ю. — Сірата. Сцэнічны абразок у 1 дзеі. Пераклала З. Верас. Стр. 8. Цана 0,20

Ігнатоўскі І. — Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. 2-е выд. Вільня 1921 г. Падручнік для школы і для самнавучаньня. Стр. 116. Цана 2.25

Ільяшэвіч Х. — Веснапесьні. Выд. Н. Ільяшэвіч. Вільня. 1929 г. Зборнік вершаў. Стр. 70. Цана 1,00

Іпіцкі У. — Сон Гаўрылы і розныя вершы. Выд. Знамяроўскага. Вільня, 1928 г. Стр. 32. Цана. 0.45

Іпіцкі Ул. — Клім бабаю і іншыя жарты. Выд. Знамяроўскага і Будзькі Вільня, 1929 г. Стр. 32. Цана . . . 0,45

Юрэвіч Г. — Задачнік для пачатковае школы. I год. Выд. 3-е папраўленае Бел. Шк. Рады. Вільня, 1921 г. Стр. 26. Цана 0.30

J. B. — Pieśni žalby. Adbitka z „Chryść. Dumki.“ Wilnia 1929 h. Kaścielnyja pieśni na Wialiki Post. Str. 15. Cana 0,30

J. S. — Ružaniec Najświaciejšaj Dziewy Maryi. Wyd. „Chryśc. Dumki“. Wilnia 1928 h. Str. 35. Cana 0,40

I. P. Д-р. — Асновы хрысьціянскай веры для беларускага народу. Вільня 1927 г. Стр. 45. Цана . , ... 0,30

І. С. — Марксызм і нацыянальнае пытаньне. Выд. Бел. Сял.-Работ. Пасольскага Клюбу. Вільня, 1929 г. Стр. 68. Ц. 1.20

З краю.

Ахвяры недагляду маткі. У в. Углы, Празароцкаў гм. Дзісненскага пав. 10 г. м. нядбалая матка пакінула ў хаце 2 дзяцей, а сама пашла на пахадушкі. Дзеля таго, што ў хаце было холадна, насыпала ў кацёл жару, паставіла яго сярод хаты і сказала дзецям „грэцца“. На адным дзіцяці ад гэтакага аграваньня загарэлася адзежа і дзіця згарэла, а другое дзіця тушачы агонь папаліла сабе рукі. Цяпер нядбалая матка свабодная, бо адно дзіця на магільніку, а другое ў шпіталі

Да нас пішуць.

АБ ДАМАГАНЬНЯХ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ І ІЛЖЫ ПОЛЁНАФІЛАЎ.

Клецк, Нясьвіскага пав. Сяляне нашага беларускага краю ў мінулых гадах і летась падавалі дэклярацыі на беларускую школу. Але на жаль вельмі мала дзе беларуская школа адкрыта. У нашым Нясьвіскім павеце ў 1925 г. падана дэкляцыяў вельмі многа, але школаў беларускіх ня чуваць. Чуваць было толькі, як інспэктар школьны правяраў дэклярацыі, аб чым пісалі ў той час беларускія газэты. Гэтакая праверка хіба-ж будзе і ў гэтым годзе паданых дэклярацыяў у 1929 г. Дзеля гэтага бацькі, падаўшыя дэкляцыі, павінны пры праверках заявіць, што дэкляцыяў сваіх не зьмяняюць і жадаюць, каб была адчынена беларуская школа.

* * *

Прыпадкова папаўся мне ў рукі „Kurjer Poranny“ (10.I. 1930 г.), у якім знайшоў я вестку памёршай полёнафільскай „Прасьветы,“ дзе пішацца аб тым, што быццам беларусы ня хочуць беларускай школы. З гэтай весткі сьмяяліся ня толькі беларускія сяляне, але й польскія вучыцялі. Дзівіцца прыходзіцца, што „наша“ полёнофілія з пад сьцягу памёршай „Прасьветы“ і так бясстыдна лжэ. Дзіўна такжа, што полёнафілы лгуць ня толькі беларусам, але і палякам. На што гэта патрэбнае лгарства. Але гэтыя беларускія полёнафілы дык ня ўсе аб адным лгуць. Кожны з іх мае свой кірунак. Адзін з іх кажа палякам, што беларусы ня хочуць беларускай школы, а другі ўгаварывае беларусам, што для беларусаў праваслаўных не патрэбны цяпер Сабор Праваслаўнай Царквы. Ну і лгуць-жа, як нанятыя. Але няхай сабе, ўсёроўна ніхто ім ня верыць.

Званок.

НАШЫ „ЦЮЦІКІ“.

Лебедзева, Маладэчанскага пав. Жыцьцё змушае да змаганьня. Змаганьне за жыцьцё ёсьць вялікае. Шырэйшы жыцьцёвы пагляд змушае змагацца за правы нацыянальныя, сацыяльныя, культурныя і палітычныя. Перашкоды ў гэтай працы спатыкаюцца з рожных бакоў. З боку сільных гэтага сьвету і з боку маленькіх подленькіх людзей, якія за голую костку служаць паном на сваю ўласную некарысьць. Яны толькі і служаць пакуль ім пан не пакажа пальцам і ня скажа „кусі“, а тады ўжо яны ведаюць, што ім трэба брахаць.

У нас ёсьць пару такіх асоб, якія па загаду брэшуць і на беларускі адраджэнскі рух і на тых людзей, якія ідуць з гэтым рухам. Імя гэтых людзей „цюцікі“. **С.**

ДУРНАЯ ЗАБАЎКА.

в. **Скрыбоўцы**, Лябецкай гм. Шчучынскага пав. У нас няма ніякай беларускай арганізацыі. Моладзь ходзіць самапасам. Самапас не заўсёды добры. Моладзь мусіць мець кіраўніцтва. Найлепшым кіраўнікомм моладзі ёсьць арганізацыя. Дзеля таго, што ў нас няма ніякай сваёй арганізацыі, дык моладзь і ходзіць дзікім самапасам. Ня ўмее нават палюдзку забаўляцца. У сваіх забаўках наша моладзь выдумывае ліха ведае што і ходзіць па вуліцы страшачы дзяцей.

Дарагая моладзь, кінь брыдкія і дурныя забаўкі! Зарганізуйся ў гурток Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, навучыся які-колечы сцэнічны твор, зладзь спэктакль-вечарыну, на якую прыдуць і старэйшыя, а ты, дарагая моладзь, гэтым забавіш сябе, другіх і будзеш рабіць культурную працу. Выпішы так-жа часопісь моладзі „Шлях Моладзі“ і ў вольны час чытай. Трэба гадавацца на людзей, а не на дзікароў. Дык да працы над узгадаваньнем!

Скрыбаўскі.

АБ ПОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ.

Маладэчанскі пав. Кожнаму добра ведама, што Маладэчанскі павет заселены беларусамі. Аднак апякуны нашыя стараюцца даць выгляд яму, хоць з вонку чыста Польскі. Натварылі ў ім мноства бяздзейных польскіх арганізацыяў, апіраючы іх на польскіх асадніках і ўрадоўцах. Гэтых польскіх арганізацыяў так многа, што і паралічыць трудна. Але ані воднай няма хоць менш больш дзейнай. Усе яны толькі на паперы. У кожным мястэчку лік польскіх арганізацыяў большы, як палякоў. Прыкладам у м. Лебедзеве, дзе ёсьць польскія асаднікі, гэтых папяровых польскіх арганізацыяў ёсьць аж 4: — „Звёнзак асаднікаў“, „Кулка рольнічэ“, „Стоважышэне Млодзежы Польскай“ і „Кола Госоодынь польскіх“.

Рэч зразумелая, што ўсе гэтыя „зьвёнзкі, кулкі, стоважыжэньні і колы“ пустыя, бо не хапае сяброў. Добра калі такая арганізацыя мае трох сяброў, а то бывае, што адзін чалавек выконывае абавязкі прэзыдыяльныя трох арганізацыяў. Словам, польскіх арганізацыяў хапае, толькі не хапае для іх сяброў. Поўная адсутнасьць польскага элемэнту ў параўнаньні з шырокай сеткай польскіх арганізацыяў.

Гэтыя польскія арганізацыі матэр‘яльна даволі багатыя. Рассылаюць сваіх інструктароў, якія склікаўшы праз солтыса сялян, чытаюць лекцыі, бывае і карысныя для земляроба, але што з таго, калі гэтыя лекцыі адбываюцца ў незразумелай для нашых людзей польскай мове. Нашы сяляне, зышоўшыся на такую лекцыю, пастаяць, паглядзяць на пана агранома, паківаюць галовамі і разыдуцца нічога не зразумеўшы. На што гэта ўсё і для каго? Пара здаецца зразумець, што з беларуса паляк ня будзе. Дык ці ня лепш гэтыя грошы выдаць для беларускіх арганізацыяў да якіх вельмі прыхільны і ахвотны наш селянін? Даволі ўжо камэдыі, выклікаючай сярод нашага сялянства трагэдыю, пара ўжо брацца за працу рэальную!

Стрых — на

Праўныя парады.

Б. Сын.

З Вашага пісьма ня відаць, калі адкрыўся спадак для Вас і Вашых праціўнікаў. Але Вам радзім дабравольна не сддаваць 5 дзесяцін, а змусіць іх зьвярнуцца ў суд. У судзе Вы бараніцеся даўнасьцяй.

Redkaja akazija!

Biełaruskaja Kniharnia PAHONIA

(WILINIA, Ludwisarskaja Nr. 1)

nižejpadanych cikawych i važnych knih 20 cioch aŭtaraŭ pradaje pa niabywała tannaj canie:

№№	Aŭtar i nazoŭ knihi	stałaja cana	źnižk. cana
1	**Андэрсэн Г—Хр.** — Казкі. Кніжыца гэтых казак мае шырокую славу. Дужа важная асабліва для нашай моладзі	1,20	0,60
2	**Bobič I. Ks. dr.**—Niadzielešnija Ewanhielii i Nawuki (3 častki). Knižka karysnaja dla našaha duchawienstwa, jak padručnik biełaruskich kazańniaŭ, a tak-ža i dla narodu, jak nabožnaje światočnaje čytańnie.	3,00	1,00
3	**Додэ Альфонс** — Сэкрэт дзядзькі Карніля і іншыя францускія творы ў перакладах. Прыгожыя і цікавыя апавяданьні.	0,30	0,15
4	**Дуж-Душэўскі К. і Ластоўскі В.** — Слоўнік геомэтрычных і трыганамэтрычных тэрмінаў і сказаў. (Расейска-беларускі і беларуска-расейскі). Дужа карысны для беларускіх вучняў і студэнтаў.	2,00	0,50
5	**Dwornik Fr. dr.** — Žyćcio św. Wacława. Knižyca napisana cikawa, pryhoža wydana i bahata ilustrawana. .	1,00	0,50
6	**Грышкевіч Фр.** — Веснавыя мэлёдыі. Зборнік вершаў.	1,00	0,50
7	**Колас Якуб**—Сымон Музыка. Нязвычайна прыгожая паэма, твор вялікага беларускага паэта, празначаная для беларускай моладзі. Кніжка гэта павінна знайсьціся ў кожнай беларускай сялянскай хаце.	2,80	1,25
8	**Ластоўскі В.** — Расійска-Крыўскі (беларускі) слоўнік. Хто хоча грунтоўна знаць беларускую мову — слоўнік гэты мусіць мець. Слоўнік гэты найлепшы і найпаўнейшы з усіх дагэтуль вышаўшых беларускіх слоўнікаў. Кніга мае 832 стр.	15,00	5,00
6	**Ластоўскі В.** — Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. Вялізарная гэта кніга на 776 стр. дае нам апісаньне, прыклады і ілюстрацыі беларускіх кніг ад X-га да пачатку XIX ст. Кнігу гэту павінен мець кожны беларускі інтэлігент.	45,00	15,00
10	**Лункевіч В.** Закон жыцьця сярод жывёл і расьцін. Кніжыца зьмяшчае ў даступнай форме навуковыя весткі з жыцьця жывёлы і расьціны.	0,90	0,45
11	**Малышэў Н.** — Фізыолёгія і анатомія чалавека. Кніга гэта аб жыцьці і будове арганізму чалавека можа служыць падручнікам школьным, а такжа кнігай для саманавучаньня. Кніга багата ілюстравана	2,75	1,25
12	**Rešeć I. ks. dr.** — Z historyi apolohietyki chryścijanskaj. Karysnaja dla ŭsich tych, chto choča bližej paznać relihiju ahułam, a pradusim chryścijanskuju. . .	0,80	0,40
13	**Stankiewič St.** — Śmiech nia hrech. Duža cikawyja wieršy — žarty. .	0,65	0,40
14	Сцэнічныя творы: a) Боты b) Мікітаў лапаць c) Пакой у наймы d) Чорт і баба.	1,20	0,60
15	**Віппэр Р. праф.** — Новая Гісторыя.	2,50	1,00
16	**Віппэр Р. праф.** — Навейшая Гісторыя . . . . Абедзьве гісторыі Віппэра годныя для школы і для саманавучаньня.	3,20	1,00
17	Сьпявак Блёндэль, з англійскай мовы пераклад. В. Л. Прыгожае апавяданьне.	0,20	0,20
18	**Зеленскі В.** — Батаніка. Кніжку гэту павінен мець кожны, хто жадае пазнаць цікавае жыцьцё расьцін. Кніга шмат мае ілюстрацыяў	4,75	1,50
19	З роднае нівы. Зборнік прыгожага пісьменства, папулярнае веды, інфармацыяў аб грамадзкім жыцьці і ўстановах. Кніжка багата ілюстравана. . .	1,00	0,50
20	**Stankiewič Ad. Ks.** — Rodnaja mowa ŭ światyniach. Histaryčny narys ab užywańni ŭ kaściele biełaruskaj mowy. Knižyca padaje cikawyja fakty, napisana dastupna, bahata ilustrawana. . .	1,50	1,00

Hramadzianie! Wyšejaznačanych duža tannych, cikawych i karysnych biełaruskich knih kniharnia „Pahonia“ maje lik ahraničany, dziela hetaha kožny pawinien paśpiašycca z kuplaj ich. Zakazy dla prawincyi wysyłajucca poštaj pa atrymańni ŭsiej wartaści zakazaŭ, abo nakładnoj płataj (za pabraniem) pa atrymańni treciaj častki wartaści zakazu.

Biełaruskaja Kniharnia „PAHONIA“
Wilno, Ludwisarska 1.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны Вільня, Завальная 6—10. Выдавец Альбін Стэповіч